*ТВАЕ ЛЮДЗІ, ПРЫСТАЛІЧЧА*

# ГАСПАДЫНЯ «КНІЖНАГА ДОМА»



**Гаварыць аб рабоце Абчакскай сельскай бібліятэкі лёгка і прыемна. Справы ідуць тут павольна, дакладна. Менавіта сюды прыходзяць жыхары не толькі за літаратурай, свежай прэсай, а і пагаварыць пра жыццё. Заўсёды ветлівая, бібліятэкар Г.У. АЗАНОВІЧ імкнецца да таго, каб задаволены былі ўсе — ад малых дзяцей да людзей сталага ўзросту.**

Амаль хатняя атмасфера, светлая і ўтульная зала, у абсталяванні якой многае зрабілі муж Барыс Міхайлавіч, сыны Цімафей і Андрэй, вабяць наведвальнікаў. Увогуле, сама Галіна Уладзіміраўна шмат робіць для павелічэння колькасці чытачоў, арганізацыі культурна-выхаваўчай і інфармацыйнай дзейнасці бібліятэкі. У сучасных умовах вялікая ўвага надаецца зместу вольнага часу. Сёння ідзе адраджэнне нашай нацыянальнай культуры, гісторыі. У гэтым напрамку Галіна Уладзіміраўна арганізоўвае і праводзіць своеасаблівыя народныя святы з выкарыстаннем мясцовых звычаяў, традыцый. Безумоўна, гэта праца цесна звязана з краязнаўчай дзейнасцю бібліятэкі. Аб'яднала яна юных чытачоў у дзіцячы клуб па інтарэсах «Чамучкі». Сабраны цікавы матэрыял па краязнаўству і гісторыі вёскі Абчак. Час ідзе хутка, перагортваючы старонкі жыцця вёскі і яе жыхароў, беражліва захоўваючы летапіс для наступных пакаленняў.

Арганізоўваюцца і праводзяцца тут літаратурныя вечары, чытанні, інфармацыйныя паведамленні, чытальніцкія канферэнцыі — адным словам, ідзе вялікая, карпатлівая праца.

Асобнай старонкай у бібліятэцы прадстаўлены матэрыялы аб удзельніках Вялікай Айчыннай вайны, нашых земляках, якія сведчаць аб мужнасці, славе, гераізме людзей. Наведваючы аднавяскоўцаў-ветэранаў, Галіна Уладзіміраўна не толькі папаўняе бібліятэчны архіў расказамі і ўспамінамі былых салдат, але імкнецца абавязкова дапамагчы старым. Дзякуючы яе намаганням тэрыторыя вакол помнікаў і брацкіх магіл у Абчаку заўсёды добраўпарадкавана.

Сапраўдная гаспадыня «кніжнага дома» — так гавораць аб Галіне Уладзіміраўне Азановіч, якая больш 25 гадоў працуе ў бібліятэцы. Апантаны сваёй справай энтузіяст і наватар. Робіць сваю справу з натхненнем, якое не губляецца па дарозе часу, а ператвараецца ў актыўны творчы працэс.

Днямі Галіна Уладзіміраўна адзначыла свой юбілей, з якім ад усёй душы калегі віншуюць яе, жадаючы творчых поспехаў, доўгіх гадоў плённай працы, здароўя і вялікага жаночага шчасця.

**Святлана КОЎЗЕЛЕВА, МРЦБ.**

**Прысталічча. – 2011. – 2 красавіка. – С.8.**